# Кнігі– юбіляры беларускіх пісьменнікаў 2024 года




Наша стагоддзе перапоўнена інфармацыяй. Атрымаць яе чалавек можа не проста хутка, а імгненна. Гэтаму спрыяюць Інтэрнэт і разнастайныя месэнджэры. Усё мяняецца, перабудоўваецца, відазмяняецца ...

Ці ёсць дзе тое месца адпачынку для чалавечай душы? Вядома. Гэта - кніга. Прычым усё роўна, якая гэта кніга - папяровая або электронная.

Запрашаем Вас у свет кніг, якія адзначаюць юбілей у 2024 годзе.

50 год




**Р.Баравікова,** першы зборнік паэзіі ***“Рамонкавы бераг”*** — **(1974)**

Раіса Баравікова з цяплом і пранікнёнасцю піша аб роднай Беларусі, аб добрым праменным свеце чалавечых узаемаадносін, аб дружбе і каханні. Уражанні юнацтва, роздум аб сэнсе жыцця, аб пошуках свайго месца ў ім робяць вершы Баравіковай цікавымі і запамінальнымі.

65 год




**П.Броўка,** зборнік вершаў *“Пахне чабор”* – **(1959)**

Прыкладам самай высокай паэзіі ў творчасці Петруся Броўкі служаць вершы, у якіх ён паказвае сябе як выдатны майстар лірычнага слова. Цудоўна гучаць пейзажна-любоўныя вершы, прасякнутыя элегічным пачуццём, у іх праз драматызацыю лірычнай інтанацыі раскрываецца туга чалавечай душы па былым каханні.




50 год

**Р.Барадулін,** зборнік паэзіі ***“Рум”*** – **(1974)**

**Зборнік “Рум”** ў 1976 годзе адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Янкі Купалы. Новыя рысы набывае паэтыка. Вершы Барадуліна адкрываюць нам нешта надзвычай істотнае, важнае ў маральным аблiччы самога паэта і яго пакалення. Духоўныя крытэрыі суровага ваеннага і пасляваеннага часу для яго жывыя і актуальныя і сёння, нездарма ён патрабуе “так адзін аднаго паважаць, як пасля вайны паважалі!”.

60 год




## Я. Брыль, раман *“Птушкі і гнёзды”* – (1964)

Раман Янкі **Брыля “Птушкі і гнёзды”** – адзін з лепшых антываенных твораў у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя. Ён неаднаразова ўключаўся ў школьныя вучэбныя праграмы для тэкстуальнага аналізу, або рэкамендаваўся да абмеркавання на ўроку дадатковага чытання. **“Птушкі і гнёзды”** – былі новай старонкай ў беларускай літаратуры. Ніхто з нашых пісьменнікаў не пісаў раней пра жыццё ў фашысцкай Германіі да нападзення яе на СССР. Гэта жыццё мала каму было вядома.




**К. Буйло,** першы зборнік вершаў *“Курганная кветка”*, – **(1914)**

**Першы зборнік «Курганная кветка»** па сваім рамансавым гучанні нагадвае лірычны мюзікл, які яшчэ абавязкова будзе пастаўлены на сцэнах беларускіх тэатраў.




60 год

В.Быкаў, аповесць **“Альпійская балада”** – (1964)

«**Альпійская балада**» **Быкава** - знакаміты твор аўтара, які распавядае нам аб сапраўдным, глыбокім пачуцці, якое не выбірае час і ўмовы для свайго з'яўлення. Дзеянне адбываецца ў сярэдзіне Другой Сусветнай вайны, у Аўстрыі, у лагеры ваеннапалонных каля Лахтальскіх Альпаў. Ноччу зноў была бамбёжка, пасля якой з раніцы пяцёра ваеннапалонных у паўразбураным цэху завода знайшлі неразарваную бомбу.

**60 год**




**А.Вольскі,** кніжка для дзяцей *“Чарнічка”* – **(1964)**

Верш **“Чарнічка”** Артура **Вольскага** у даходлівай і блізкай для дзіцячага ўспрымання форме паэт малюе жыццё адухоўленай ягадкі чарнічкі, якая расце «ў засені сосен, дзе мох, ды іглічка расла даспявала красуня-чарнічка». Яна як жывая істота ўмывае свой тварык, грэе на сонцы плечыкі, загарэла нібы негрык і быў у яе адзін сябар лісточак, які і аберагаў чарнічку ад ўсіх лясных ворагаў.




60 год

## У. Дубоўка, казка “Мілавіца” – (1964)

Гэта казка пра пясок. Быў адзін хлапчына з васільковымі вачыма. Ён працавіты. Аднойчы сонца прыпыніла свой ход. Вось хлапчына пайшоў у тую старонку дзе стаяла сонца, каб дазнацца прычыны. Дайшоў ён да Палесся. У пушчы зайшоў у хату. Дзед, што жыў у гэтай хаце расказаў яму пра дзяўчыну Мілавіцу, ён параіў хлопцу ісці дадому, бо журба па той дзяучыне ўпадзе ў сэрца і не выйдзе аж да смерці. Хлопец не паслухаўся дзеда. Выйшаў да ракі Прыпяці, убачыў Мілавіцу. Завёў з ёй хлопец размову, расказаў аб цудзе. Як ён яе знайшоў і цяпер напэўна згіне. Дзяўчына папрасіла каб хлопец зрабіў ёй з пяску чаравікі. Сумны пайшоў хлопец дахаты. Доўга рабіў ён такія чаравікі. Папрасіў дапамогі ў сонейка. Сонца ход свой прыпыніла і пясочак растапіла. Зрабіў хлопец чаравікі. Мілавіца прыняла дарунак і аддала яму сэрца, а хлопец павёў яе на сваю радзіму. Многа змянілася на свеце і там дзе хлопец рабіў з пяску абутак, там цяпер шкляная гута. Мые ёй пясочак Нёман. Там цяпер вырабляюць крышталь.




45 год

## **У. Караткевіч,** раман ***“Чорны замак Альшанскі”*** – **(1979)**

«**Чорны замак** Альшанскі» — дэтэктыўны раман Уладзіміра Караткевіча. Гісторыя сыходзіць каранямі ў глыбокую старажытнасць 15 стагоддзя. У тыя далёкія смутныя часы князь Альшанскі крадзе скарб і каштоўнасці паўстанцаў, але раптам памірае, пакінуўшы манускрыпт, у якім паказана месцазнаходжанне скарбаў. Палеограф і пісьменнік Антон Косміч знаходзіць пергамент з шыфраваным указаннем пра схаваныя ў сутарэннях Альшанскага замка скарбы.




**Я. Колас,** аповесць *“Дрыгва”* – **(1934)**

Аповесць “**Дрыгва**" з´яўляецца выдатным творам у літаратуры, у якім знайшлі выражэнне адметныя рысы рэалізма Я. Коласа: уменне стварыць глыбока тыповы вобраз на аснове жыцця канкрэтнай гістарычнай асобы.




100 год

**Я. Купала,** п’еса *“Тутэйшыя”* – **(1924)**

У п'есе «**Тутэйшыя**» выявілася вялікая трывога аўтара за духоўную спадчыну беларускага народа, яго нацыянальную свядомасць. З тутэйшасцю — беспрынцыповасцю, недастаткова развітай свядомасцю, пасіўнасцю, скоранасцю — трэба змагацца, лічыць драматург. Падкрэсліваючы трагедыйны лад п'есы, Я. Купала назваў яе «трагічна-смяшлівымі сцэнамі». У вобразе галоўнага персанажа Я. Купала ўвасобіў тып нацыянальнага нігіліста, здрадніка.




55 год

**А. Макаёнак,** п’еса ***“Зацюканы апостал”*** – **(1969 )**

У адной звычайнай сям'і, дзе сталым напляваць адзін на аднаго і тым больш на дзяцей, растуць Дачка, даверлівая і добрая, і Сын — чужы ў сваёй сям'і, гарачы, прынцыповы, не па гадах разумны. Сын мае вызначаную мэту, да якой няўхільна ідзе. Ён жадае стаць высокапастаўленым палітыкам, ці, як ён кажа, «цэзарам». Але разумее, што ў такім разе трэба пазбаўляцца ад такіх маральных якасцяў, як спагада, памяркоўнасць, жаль, паблажлівасць да блізкіх…




90 год

**Я. Маўр,** апавесць ***“ТВТ”*** – **(1934)**

У сваіх творах пісьменнік стварыў яркія чалавечыя характары, у якіх на першым плане — гуманізм, высакароднасць, мужнасць. Не можа не зацікавіць школьнікаў прыгодніцкая аповесць «ТВТ», дзе асноўныя дзеючыя асобы — члены Таварыства ваяўнічых тэхнікаў. Яны аб'явілі вайну няўменню: усё для сябе робім самі і гатовы дапамагчы іншым.




65 год

## П.Панчанка , зборнік *“Кніга вандравання і любові”* – (1959)

У пасляваеннай паэзіі **П. Панчанкі** гучаць грамадзянскія матывы: барацьба за мір, услаўленне сацыялістычнага ладу, палёты ў космас. **Зборнікі** паэта «За шчасце, за мір», «Шырокі свет», «**Кніга вандраванняў і любові**», «Тысяча небасхілаў» (1962). Напісаная ў гэтыя гады лірыка-публіцыстычная паэма «Патрыятычная песня», у якой паэт выказвае шчырае прызнанне ў любві да Радзімы, да людзей, была ў 1959 г. узнагароджана Літаратурнай прэміяй імя Янкі Купалы. У сваіх творах Пімен **Панчанка** шчыры патрыёт Беларусі, нястомны змагар за захаванне прыроды, за культываванне ў грамадстве высокіх маральных ідэалаў.




**60 год**

## І.Шамякін, раман *“Сэрца на далоні”* – (1964)

Асноўная сюжэтная лінія рамана — змаганне за добрае імя доктара Савіча, які доўгія гады лічыўся здраднікам. У эпіцэнтры гэтага змагання апынуўся пісьменнік Шыковіч, чалавек няўрымслівы і імпульсіўны. Да гонару Шыковіча, імкненне да праўды вяло яго ў працы над узнаўленнем гісторыі гарадскога падполля.

50 год




## **І.Шамякін,** раман ***“Атланты і карыятыды”*** – **(1974)**

У рамане «Атланты і карыятыды» пісьменнік даследуе важныя сацыяльна-маральныя і сямейна-бытавыя праблемы. У творы цэнтральным героем з'яўляецца Максім Карнач. Ён — галоўны архітэктар горада — паўстае перад намі як дзейсны і мэтанакіраваны чалавек. Карнач думае пра тое, якім будзе аблічча ягонага горада, у якім асяроддзі будуць жыць людзі. Таму ён выступае супраць размяшчэння на тэрыторыі горада хімічнага камбіната.

# Дзякуй за ўвагу!



Мы вас чакаем
па адрасу:
пл. Леніна, 5